# У вандроўку па вуліцы Ажэшкі

**Літаратурна-гістарычнае свята, прысвечанае гісторыі вуліцы Элізы Ажэшкі, адбылося ў Гродне. Усё жыццё знакамітай пісьменніцы было звязана з нашым старажытным горадам, яго блізкімі і далёкімі ваколіцамі.**



Як паведаміў начальнік Галоўнага упраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Павел Канстанцінавіч Скрабко, у мінулым годзе напярэдадні адзначэння Дня народзінаў Элізы Ажэшкі адбылося свята, прысвечанае каралеве польскай прозы. Супрацоўнікі навуковай бібліятэкі імя Карскага, праект "Жывая гісторыя" Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы, калекцыянеры вырашылі штогод адзначаць такое свята. У гэтым годзе яго прысвяцілі гісторыі вуліцы Ажэшкі.

Гродзенцы і госці Гродна пазнаёміліся з побытам, культурай, традыцыямі жыхароў горада XVIII-XIX стагоддзяў, тым куточкам, дзе жыла пані Эліза. Тут размясціліся экспазіцыі старых і сучасных фотаздымкаў вуліцы, каштоўных выданняў з фондаў абласной бібліятэкі па гісторыі Гродна і вуліцы Ажэшкі; прайшлі майстар-класы народных умельцаў, старадаўніх танцаў, сустрэчы з героямі твораў пісьменніцы: вобразамі беларусаў, яўрэяў, палякаў. Госці свята пачулі іх песні, музыку, вершы.

Эліза Ажэшка – своеасаблівы сімвал Гродна. Яе творчая спадчына налічвае каля 150 мастацкіх, публіцыстычных, літаратуразнаўчых твораў, больш за 10 тамоў пісьмаў. Творы пісьменніцы перакладзены на 20 моў свету, у тым ліку кітайскую і японскую. Акрамя таго, Э.Ажэшка займалася культурна-асветніцкай і дабрачыннай дзейнасцю: праводзіла літаратурныя лекцыі, арганізоўвала масавыя чытанні, на Каляды ладзіла святы вакол елкі для дзяцей-сірот. У 1907 годзе Эліза Ажэшка была ўзнагароджана дыпломам ганаровага грамадзяніна г.Гродна.

***Вольга Кацько***

***Фота аўтара***